процессах : сб. науч. тр. / Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь. – Минск : Право и экономика, 2011. – С. 283–304.

# Баранавічы — Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага (1914 – жнівень 1915 гг.)

*Бондарава Н. А., студ. IV к. ГрДзУ ім. Я. Купалы,*
*навук. кір. Іванчук Б. М., канд. гіст. навук, дац.*

1 жніўня 1914 г. пачалася першая сусветная вайна. У беларускіх губернях было аб'яўлена ваеннае становішча. З першых дзён вайны ўся Расійская імперыя спрабавала сачыць за тым, што адбывалася ў Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага – вышэйшым ваенным органе кіравання дзеяннямі рускімі войскамі, створаным 3 жніўня 1914 года.

Месцазнаходжанне яе для пераважнай большасці насельніцтва было невядома па відавочных прычынах. Гэта таямнічасць была звязана з тым, што менавіта тут працавалі галоўныя кіраўнікі вайны. Даследванні сённяшняга часу кажуць аб тым, што Стаўка знаходзілася ў Паўднёвым мікрараёне Баранавіч, паміж вуліцамі Войкава, Мерацкова, Свярдлова [1, с. 3].

Тут, у мястэчку Баранавічы, у глыбіні лясоў, у сталых напружаных працах праводзіў свой час Вярхоўны Галоўнакамандуючы, князь Мікалай Мікалаевіч, абмяркоўваючы з кіраўніком свайго штаба, генералам Янушкевічам і генералам-кватэрмайстрам Данілавым усе падрабязнасці ваенных дзеянняў рускага мільённага войска.

Пры самім Вярхоўным склалася світа з дзесяці чалавек, з іх шэсць ад'ютантаў. Пры штабе знаходзіцца 15 афіцэраў Генеральнага штаба. У Стаўцы ўвесь час знаходзіліся ваенныя агенты саюзнікаў: бельгійскі капітан Семе, сербскі падпалкоўнік Леанткевіч, англійскі генерал Вільямс, французскі генерал Маркіз де Лагіш, бельгійскі генерал барон дэ Рыкель і японскі генерал Оба.

Стаўка ўяўляла сабою ўчастак чыгуначнага палатна, на якім стаялі вагоны розных класаў. Па прычыне меркаванага выезду асоб Стаўкі на дзеючыя франты, цягнік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага знаходзіўся на пуцях на станцыі Баранавічы Аляксандраўскай чыгункі [2, с. 10].

У час наведвання яе імператарам, яна атрымоўвала назву «Царскай». Вось апісанне аднаго са шматлікіх дзён, праведзеных Мікалаем II у Стаўцы: «На наступны дзень, у нядзелю 14 снежня, Гасудар а дзясятай гадзіне раніцы прыйшоў у штаб Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Вялікі князь, генералы Янушкевіч і Данілаў падрабязна вытлумачылі Яго Вялікасці ўсе абставіны

апошніх дзён. Пасля паведамлення, каля адзінаццацаці гадзін дня імператар пешшу прайшоў ад штаба да сябе ў вагон і праз некалькі хвілін выйшаў адтуль. У аўтамабілі разам з генералам Ваяйковым і асобамі світы накіраваліся ў мясцовую ваенную царкву да абедні».

Падчас апошняга наведвання Стаўкі (11–28 чэрвеня 1915 г.) Мікалай II выдаў загад аб неабходнасці правядзення ў Стаўцы паседжання Савета Міністраў Расійскай імперыі. Назапасілася шмат невырашанных пытанняў, звязаных з дальнейшым вядзеннем вайны.

Паседжанне адбылося 14 чэрвеня. Яно праходзіла ў вялікай адчыненай палатцы, каля «царскага» цягніка. Мікалай II заняў месца ў цэнтры ўсіх прысутных. Каля яго сядзелі Вярхоўны Галоўнакамандучы і члены яго Штаба, затым старшыня Савета Міністраў Гарамыкін, а затым самі міністры: міністр фінансаў Барк, міністр земляробства Крывашэін, міністр шляхоў зносін Рухлоў і іншыя.

Гарамыкін выступіў з наступнымі словамі: «З усіх ускраін роднай зямлі даходзяць да мяне звесткі, што рускія людзі гатовыя прыкласці ўсе намаганні дзеля забеспячэння арміі ўсім неабходным». Так быў складзены спіс прадпрыемстваў Мінскай губерні, занятых выкананнем заказаў па дзяржаўнай абароне, сярод якіх значыліся: Рэчыцкі лесапільны завод, Мозырскі фанерны завод, Мінскі механічны завод, Пекарна-сухарны завод мястэчка Баранавічы-Разводава і інш. [3, с.809].

Пасля падзей 14 чэрвеня жыццё Стаўкі працякала ў звычайным парадку. З фронту даносіліся розныя звесткі, якія ў асноўным пацвярджалі тое, што рускія войскі ўпэўнены ў поўнай перамозе над ворагам. Аднак палажэнне спраў рэзка змянілася. Вайна перакінулася на беларускія землі. Жнівеньскае наступленне немцаў разгортвалася ў накірунку Коўна–Вільня–Мінск. Дарогі былі забіты бежанцамі, кінутымі на волю лесу, сярод іх пачалася эпідэмія тыфу. Стаўка больш не кантралявала сітуацыю. Аднаго ўдару германскіх частак было досыць, каб прымусіць уцякаць цэлае войска. 8–9 жніўня 1915 г. Стаўка пераехала ў Магілёў [4, с. 20].

**Літаратура**

1. Шчарбакоў, С. А. Таямніца Стаўкі разгадана (1914–1915 гг.) // Наш край. – 2000. – 4 кастычніка. – 3 с.

2. Татарынаў, Ю. А. Гарады Беларусі. Брэшчына / Ю. А. Татарынаў. – Мінск : Смэлток, 2010 – 84 с.

3. Краўчанка, І. С. Дакументы па гісторыі Беларусі (1900–1917) : у трох тамах. Т. 3 / І. С. Краўчанка. – Мінск : выдавецтва АН БССР, 1953. – 1018 с.

4. Бондарава, Н. А. Баранавічы падчас Першай сусветнай вайны // Літаратура і мастацтва., 2011. – 4 лістапада. – 20 с.